# Таленты Ашмянщыны

20 жніўня 2019 года ў аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" ў рамках мерапрыемстваў прымеркаваных 75-ддзю Гродзенскай вобласці адбыўся творчы вечар з маладым таленавітым музыкам, нашай зямлячкай Таццянай Грыневіч-Матафонавай. Ва ўтульнай зале сабраліся людзі, якія любяць свой край і музыку. Песні пад рамантычныя і шчырыя акорды гітары на словы беларускіх паэтаў напаўнялі залу сваёй лірычнасцю, душэўным цяплом і любоўю да сваёй зямлі. Выкананне кожнага твора знайшло водгук у душы слухачоў.

Гледачы выказвалі словы падзякі і ўдзячнасці, захапляліся ўнікальнымі здольнасцямі і сапраўды ганарыліся, што такі таленавіты чалавек нарадзіўся на нашай Гродзеншчыне.





